Мінск, 12 лютага 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Сардэчна віншую Вас з нагоды 25-й гадавіны ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Венгрыяй.

З задавальненнем адзначаю, што за гэты перыяд мы разам прайшлі шлях пабудовы ўстойлівага фундаменту сяброўскіх адносін, якія грунтуюцца на прынцыпах павагі і ўзаемнага разумення.

У Беларусі і Венгрыі паспяхова працуюць дыпламатычныя прадстаўніцтвы абедзвюх краін, спрыяючы развіццю двухбаковых кантактаў. Створана салідная дагаворна-прававая база. Нашы краіны актыўна ўзаемадзейнічаюць у рамках міжнародных арганізацый, у тым ліку па глабальных праблемах сучаснасці.

Забяспечваецца шчыльны і арыентаваны на дасягненне выніку дыялог паміж міністэрствамі замежных спраў, які паступова пашыраецца на новыя тэмы ўзаемнага інтарэсу. Запэўніваю Вас, што для Беларусі ў гэтым сяброўскім дыялогу закрытых тэм не існуе.

З удзячнасцю адзначаю паслядоўную і шчырую пазіцыю венгерскай дыпламатыі ў пытанні наладжвання прадметнага беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва. Разлічваем і надалей на падтрымку Будапештам курса Беларусі на ўмацаванне незалежнасці, рэалізацыю шматвектарнай знешняй палітыкі.

Адным з галоўных прыярытэтаў з'яўляецца развіццё гандлёва-эканамічных стасункаў. На працягу апошніх гадоў Венгрыя стабільна ўваходзіць ў трыццатку асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі ў свеце. Створана і працуе Міжурадавая Беларуска-Венгерская камісія па эканамічным супрацоўніцтве, на рэгулярнай аснове праходзяць беларуска-венгерскія бізнес-форумы, паступова нарошчваюцца кантакты паміж рэгіёнамі.

Разам з тым, упэўнены, што патэнцыял гандлёва-эканамічнага і асабліва інвестыцыйнага ўзаемадзеяння яшчэ далёка не выкарыстаны і патрабуе далейшых зладжаных дзеянняў абодвух бакоў.

У гуманітарнай сферы дасягнуты відавочны прагрэс – забяспечваецца выкладанне беларускай і венгерскай моваў у нашых краінах, пашыраецца абмен студэнтамі. Добрай традыцыяй стала правядзенне Дзён культуры Беларусі і Венгрыі ў абедзвюх краінах. Паказальна, што і 25-ые ўгодкі дыпламатычных стасункаў мы адзначаем яскравымі культурнымі мерапрыемствамі.

Мы пазбаўлены негатыўных стэрэатыпаў мінулага, актыўна і супольна працуем над тым, што злучае нашы краіны і народы.

Упэўнены, што паслядоўная рэалізацыя значнага патэнцыялу двухбаковага супрацоўніцтва, будзе і надалей спрыяць дынамічнаму развіццю сяброўскіх адносін паміж нашымі краінамі ў інтарэсах беларускага і венгерскага народаў.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, найлепшыя пажаданні моцнага здароўя, шчасця і поспехаў, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей